## У Мінску прэзентавалі наноў выданую кішэнную кнігу Скарыны




**У кнізе 217 старонак, на якіх акрамя сучасных тэкстаў прыведзена факсімільнае ўзнаўленне “Кнігі Юдзіфі".**

23 верасня ў мінскай кнігарні «Светач» адбылася прэзентацыя мініяцюрнага выдання «Кнігі Юдзіфі» Францішка Скарыны, выпушчанай сёлета ў Баку. У прэзентацыі прынялі ўдзел ініцыятар выдання - заснавальнік Музея мініяцюрнай кнігі ў г. Баку Зарыфа Салахава, аўтары тэкстаў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша і загадчык аддзела бібліятэкі Галіна Кірэева, а таксама прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Пасольства Азербайджана ў Беларусі.

Як паведаміў у сваім Facebook Алесь Суша, кніга ўбачыла свет у выдавецтве «Indigo print house» у серыі «Кніжная спадчына Францішка Скарыны», дзякуючы ўдзелу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Кангрэса азербайджанскіх супольнасцяў Рэспублікі Беларусь.

У кнізе 217 старонак, на якіх акрамя сучасных тэкстаў прыведзена факсімільнае ўзнаўленне «Кнігі Юдзіфі», выдадзеннай Скарынам у Празе 9 лютага 1519 г. У прадмове да кнігі Скарына коратка выкладае гісторыю Асірыйскай, Вавілонскай і Персідскай дзяржаў, а таксама абставіны патрыятычнага ўчынку Юдзіфі. Кніга была выдадзена на царкоўна-славянскай мове беларускай рэдакцыі. Да гэтага часу захавалася 9 экзэмпляраў выдання.

«Кніга Юдзіфі» - старазапаветная біблейская кніга, якая апісвае гісторыю аб уратаванні ізраільскай удавой свайго горада ад нашэсця асірыйцаў.

Сёлетняя акцыя прымеркавана да 500-годдзя пачатку Скарынам беларускага кнігадрукавання. Нагадаем, першай беларускай друкаванай кнігай стала менавіта Біблія.